*І. Г. Лупашка*
(Мінск)

**Рэгіянальныя музеі**
**як культурныя і турыстычныя цэнтры**
(на прыкладзе рэгіянальных філіялаў
літаратурных музеяў)

У сучасных умовах інфармацыйнага грамадства ўзрастае роля культуры, нацыянальных традыцый, літаратуры, мастацтва. Кожная нацыянальная культура мае самабытныя дасягненні, якія з'яўляюцца цікавымі як для суайчыннікаў, так і для іншых народаў. Ёсць такія прыклады і ў галіне беларускай літаратуры, многія творы якой сусветна прызнаныя. Літаратурным музеям належыць значная роля ў захаванні гісторыка-культурнай спадчыны, неад'емнай часткай якой з'яўляецца літаратурная спадчына.

Пагаджаючыся з думкай расійскай даследчыцы А. Масцяніцы, заўважым, што нацыянальная культура, якая базіруецца на агульных духоўных падмурках, безумоўна, валодае спецыфічнымі адметнасцямі на ўзроўні рэгіёнаў. Яны вызначаюцца значнымі для яго жыхароў вядомымі гістарычнымі падзеямі, помнікамі, персаніфікаванымі каштоўнасцямі. Відавочна, што не існуе двух рэгіёнаў з ідэнтычнай культурнай прасторай, таму, каб максімальна эфектыўна выкарыстоўваць гісторыка-культурны патэнцыял, неабходна асэнсаваць своеасаблівасць і ўнікальнасць свайго рэгіёна [4].

Шэраг мясцін Беларусі, акрамя іншых гісторыка-культурных здабыткаў, можа ганарыцца сваёй сувяззю са знакамітымі літаратурнымі дзеячамі і музеямі, створанымі ў іх гонар.

У сістэме Міністэрства культуры дзейнічаюць 7 літаратурных музеяў і іх 11 філіялаў. Тэрытарыяльна пераважная большасць галаўных музеяў знаходзіцца ў сталіцы: Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры (далей – ДМГБЛ), Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы (далей – музей Янкі Купалы), Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа (далей – музей Якуба Коласа), Літаратурны музей Максіма Багдановіча (далей – музей Максіма Багдановіча), Літаратурны музей Петруся Броўкі (далей – музей Петруся Броўкі). Акрамя гэтага, у Мінску знаходзіцца і адзін з філіялаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча – «Беларуская хатка». З несталічных літаратурных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музеяў асобнымі ўстановамі культуры, якія рэалізуюць усе віды музейнай дзейнасці, з'яўляюцца Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку
і Музей Максіма Багдановіча ў Гродне. Астатнія рэгіянальныя літаратурныя музеі – філіялы сталічных музеяў. Чатыры мемарыяльныя сядзібы («Смольня», «Акінчыцы», «Альбуць», «Ласток») аб'ядноўвае філіял «Мікалаеўшчына» музея Якуба Коласа, які знаходзіцца ў г.Стаўбцы Мінскай вобласці. Чатыры рэгіянальных філіялы мае і музей Янкі Купалы: тры – у Мінскай вобласці (мемарыяльны запаведнік «Вязынка» і філіял «Яхімоўшчына» ў Маладзечанскім раёне, «Акопы» ў Лагойскім раёне) і адзін – у Віцебскай вобласці (мемарыяльны запаведнік «Ляўкі» ў Аршанскім раёне). Хата-музей Петруся Броўкі з'яўляецца філіялам мінскага музея паэта і знаходзіцца ва Ушацкім раёне Віцебскай вобласці. Тры рэгіянальныя філіялы мае ДМГБЛ: музей-сядзіба Францішка Багушэвіча «Кушляны» ў Смаргонскім раёне Гродзенскай вобласці, Літаратурны музей Кузьмы Чорнага ў Капыльскім раёне Мінскай вобласці і музей-сядзіба Міцкевічаў «Завоссе» ў Баранавіцкім раёне Брэсцкай вобласці. У Маладзечанскім раёне Мінскай вобласці знаходзіцца «Фальварак Ракуцёўшчына» – філіял мінскага музея Максіма Багдановіча.

Падкрэслім, што практыка стварэння філіялаў пры галаўным музеі можа лічыцца адметнасцю літаратурных музеяў. На наш погляд, такая схема развіцця сеткі літаратурных музеяў у Беларусі цалкам апраўдана. Геаграфічна Беларусь размешчана даволі кампактна, таму стварэнне некалькіх асобных музеяў аднаго літаратара бачыцца немэтазгодным. У такой сітуацыі непазбежна драбленне архіва пісьменніка, дубліраванне пэўнай часткі меморый і, як вынік, стварэнне некалькіх музеяў-блізнят. На сёння большасць філіялаў літаратурных музеяў прэзентуюць пэўныя перыяды жыцця пісьменніка, якія гістарычна ці творча звязаны з гэтымі мясцінамі.

У апошні час адбываецца пашырэнне меж разумення музея. З шэрагу магчымых кірункаў вывучэння рэгіянальных музеяў вылучым і разгледзім больш падрабязна наступныя аспекты: рэгіянальны музей як культурны цэнтр і рэгіянальны музей як турыстычны цэнтр.

Як адзначалася вышэй, філіялы размяшчаюцца пераважна ў сельскай мясцовасці, што надае пэўную спецыфіку іх дзейнасці. Аддаленасць ад галаўных музеяў і буйных гарадоў, цесны кантакт з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыццядзейнасцю мясцовага насельніцтва прадугледжваюць актыўнае ўзаемадзеянне з мясцовымі ўладамі і іншымі сацыяльнымі інстытутамі рэгіёна. Часам правінцыяльныя музеі выступаюць у якасці культурнай дамінанты, адзінага сацыякультурнага цэнтра населенага пункта і нават могуць садзейнічаць вызначэнню накіраванасці развіцця рэгіёна.

Асноўная ўвага ў філіялах надаецца культурна-адукацыйнай дзейнасці, а навукова-фондавай і экспазіцыйнай работай займаюцца пераважна навуковыя супрацоўнікі галаўных музеяў. У першую чаргу гэта звязана з невялікай колькасцю штатных адзінак навуковых супрацоўнікаў у філіялах.

На наш погляд, мясцовы музей можа стаць сапраўдным цэнтрам культуры толькі ў тым выпадку, калі асаблівая ўвага надаецца рабоце з мясцовым насельніцтвам рознага ўзросту. У Літаратурным музеі Кузьмы Чорнага ў Цімкавічах, напрыклад, праводзяцца музейна-педагагічныя заняткі ў рамках праграмы «Ганарыся сваім земляком і ведай пра яго», «Наша спадчына» (выдадзена асобным зборнікам у серыі «Музейныя сшыткі» ў 2003 г.), «Музей і дзеці», сустрэчы з пісьменнікамі і настаяцелем царквы Мікалая Цудатворца, вечарыны, музейныя святы. З мэтай папулярызацыі твораў Кузьмы Чорнага для дарослых і вучняў старшых класаў з 1997 г. пры музеі працуе студыя аматараў тэатра «Іскрынка». Яе ўдзельнікамі інсцэніраваны апавяданні Кузьмы Чорнага «Маё дзела цялячае», «Родныя мясціны», артыкул «У роднай глушы», п’еса «Базылевічава сям’я», аповесць «Насцечка». Для выхаванцаў дзіцячага сада, малодшых і сярэдніх класаў з 2003 г. працуе тэатр фланелеграфіі «Скарбонка прыгажосці». Акрамя таго, музей узаемадзейнічае і праводзіць сумесныя акцыі з работнікамі МНС, ДАІ, чыгункі і інш. [3].

Падтрымліваючы думку А. Масцяніцы, заўважым, што правядзенне разнастайных акцый, нават непасрэдна не звязаных з тэматыкай і профілем, у рэгіянальных музеях апраўдана. Гэта дазваляе ўдзельнікам гэтых мерапрыемстваў пабываць у сценах музея і, магчыма, зацікавіцца яго калекцыямі і экспазіцыямі. Для музея важна стаць для мясцовых жыхароў месцам правядзення вольнага часу і, такім чынам, заняць значнае месца ў культурным жыцці горада ці раёна [4].

Адзначым, што якасць функцыянавання рэгіянальных музеяў у многім залежыць ад асабаснай пазіцыі іх супрацоўнікаў, гэта значыць мае выразны персаніфікаваны характар. Часам менавіта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пазіцыя кіраўніка і супрацоўнікаў філіяла вызначаюць дынаміку, інтэнсіўнасць і поліфункцыянальнасць дзейнасці музея. Напрыклад, актыўная культурна-адукацыйная дзейнасць вышэйадзначанага музея Кузьмы Чорнага з’яўляецца заслугай яго загадчыка – Людмілы Ніжэвіч, якая ініцыятыўна і самаахвярна развівае гэты важны напрамак.

Яшчэ адзін магчымы кірунак развіцця рэгіянальнага музея – музей як турыстычны цэнтр.

Некаторыя філіялы літаратурных музеяў ужо даволі даўно ўключаны ў турыстычныя маршруты. Найбольш папулярнымі з літаратурных экскурсій можна лічыць тыя, якія прысвечаны класікам беларускай літаратуры Янку Купалу і Якубу Коласу: «Зямлёй Купалы» (па маршруце Вязынка – Радашковічы – Карпілаўка – Харужанцы – Акопы) і «Мой родны кут» (па маршруце Стаўбцы – Акінчыцы – Мікалаеўшчына – Высокі Бераг). Турыстычныя фірмы таксама прапануюць экскурсіі па мясцінах, якія звязаны з жыццём і творчасцю Адама Міцкевіча («Зямля Навагрудская, краю мой родны…»), Францішка Багушэвіча («Памятныя мясціны Багушэвіча»), некаторыя экскурсіі ўключаюць наведванне літаратурных музеяў у складзе комплексных краязнаўчых экскурсій.

Заўважым, што ў апошні час цікавасць да пазнавальнага турызму (да якога адносіцца і музейны турызм) расце, што намагае змен у дзейнасці музеяў і больш актыўнага выкарыстання іх у якасці турыстычных аб’ектаў. Традыцыйныя формы экскурсій, якія заснаваны пераважна на пасіўным назіранні, ужо не задавальняюць турыстаў. Становяцца запатрабаванымі новыя формы, якія ўключаюць інтэрактыўны кампанент, забаўленне, напрыклад, экскурсіі з анімацыяй. Першыя ўдалыя спробы ў гэтым кірунку ўжо ёсць. У якасці прыкладу прывядзём экскурсію-анімацыю «Шляхецкая гісторыя», якая прапануецца фондам «Краіна замкаў». Экскурсія праходзіць па маршруце Мінск – Плябань – Залессе – Кушляны – Солы – хутар Радзевічы – Мінск і ў якасці аднаго з пунктаў праграмы прадугледжвае наведванне сядзібы Багушэвічаў. Для наведвальнікаў экскурсіі распрацаваны цікавы сцэнарый, якога прытрымліваюцца ад пачатку і да канца паездкі. Так, у Кушлянах госці маюць магчымасць агледзець дом Багушэвічаў і пазнаёміцца з яго гаспадарамі. Аднак гаспадары сустракаюць гасцей не вельмі ветліва, паколькі «асцерагаюцца правакацыі». Па арыенцірам, вызначаным маладым Багушэвічам, госці адшукваюць схаваную на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лысай гары зброю, становяцца паўстанцамі і накіроўваюцца далей за царскімі жандарамі (згодна распрацаванай легендзе) [5].

На наш погляд, ёсць магчымасці ў прадстаўленні такога роду паслуг і ў іншых філіялаў літаратурных музеяў. Станоўчым момантам для ўключэння правінцыяльных музеяў у турыстычныя маршруты з’яўляецца наяўнасць музеефікаванай тэрыторыі, паколькі пераважная большасць рэгіянальных філіялаў літаратурных музеяў з’яўляюцца музеямі-сядзібамі і музеямі-запаведнікамі. Напрыклад, агульная плошча мемарыяльнага запаведніка Я. Купалы «Вязынка» – 21 га, запаведніка «Ляўкі» – 19 га, заказнік Я. Коласа «Мікалаеўшчына» ўключае тэрыторыю плошчай 269 га. Музей, які не абмежаваны толькі будынкам, заўсёды больш прывабны для наведвальнікаў і арганізатараў экскурсій. Наяўнасць дадатковай тэрыторыі дае магчымасць экскурсантам правесці на тэрыторыі музея даволі доўгі час: агледзець помнікі, проста адпачыць на прыродзе, паўдзельнічаць у анімацыі, паглядзець канцэрт і інш.

Яшчэ адзін спосаб прыцягнення турыстаў у рэгёны – турызм, прымеркаваны да пэўных падзей («событийный туризм»), які спалучае традыцыйныя туры і ўдзел у відовішчных мерапрыемствах. На наш погляд, магчымасці рэгіянальных філіялаў літаратурных музеяў у гэтым кірунку вельмі вялікія. Амаль у кожным з іх сталі ўжо традыцыйнымі конкурсы, святы, якія праводзяцца на даволі высокім узроўні. Напрыклад, у Вязынцы ўжо некалькі дзесяцігоддзяў праводзяцца Рэспубліканскія святы паэзіі, песні і народных рамёстваў, а з 2010 г. – фінальныя канцэрты аўтарскай песні «Купалаўскія вакацыі». Традыцыйным стала свята паэзіі і песні «Ракуцёўскае лета», якое праводзіцца штогод у філіяле музея Максіма Багдановіча «Фальварак Ракуцёўшчына». Шырока адзначаюцца ў філіялах і календарныя народныя святы. Усе гэтыя мерапрыемствы могуць быць адпраўным пунктам для арганізацыі турыстычных паездак. Аднак прывабнымі для турыстаў могуць быць не толькі традыцыйныя, але і разавыя мерапрыемствы, прысвечаныя, напрыклад, юбілейным падзеям. Так, свята «Ёсць у мяне зямля, край светлых мрояў…» у музеі-сядзібе Міцкевічаў «Завоссе», якое адбылося ў рамках юбілейнага праекта да 210-годдзя Адама Міцкевіча, сабрала больш за 1000 гледачоў, сярод якіх былі як мясцовыя жыхары, так і спецыяльна арганізаваныя групы з г.Мінска і г.Баранавічы [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, праблема «музеі і турызм» даволі востра стаіць на сучасным этапе і патрабуе актыўных дзеянняў па яе вырашэнні. У гэтай сітуацыі становіцца неабходным больш цеснае ўзаемадзеянне турыстычных фірм і музеяў, сумесны пошук новых формаў дзейнасці. Гэтыя пытанні ўздымаюцца і на дзяржаўным узроўні: у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь на 2011–2015 гг. (падпраграма «Кадравае, навуковае і вучэбна-метадычнае забеспячэнне ў сферы турызму») праводзіцца шэраг мерапрыемстваў, якія закранаюць гэтыя праблемы. Так, у чэрвені 2012 г. на базе музея Якуба Коласа і яго філіялаў у Стаўбцоўскім раёне адбыўся семінар «Магчымасці музеяў як складаючая частка турызму падзей і адзін са спосабаў прыцягнення турыстаў у рэгіёны». Азнаёміўшыся з магчымасцямі музеяў-філіялаў як аб’ектаў турысцкай індустрыі, прадстаўнікі турфірм прыйшлі да высновы, што частку экскурсійных маршрутаў, якія праходзяць праз Стаўбцоўшчыну, неабходна перагледзець і ўключыць у іх наведванне Коласаўскага заказніка.

Пры належным узроўні турызму рэгіянальная культурная спадчына можа разглядацца як своеасаблівы эканамічны рэсурс, што вельмі значна для развіцця рэгіёнаў. Наладжванне дзейнасці пунктаў харчавання, гандлёвых кропак, далучэнне да ўдзелу ў музейных праграмах і мерапрыемствах мясцовых фальклорных калектываў і народных тэатраў – усё гэта можа прыносіць прыбытак у мясцовы бюджэт і ствараць дадатковыя працоўныя месцы. Пры вырашэнні гэтых пытанняў зноў паўстае праблема цеснага ўзаемадзеяння з мясцовымі ўладамі, без садзейнічання якіх умацаванне пазіцый музея ў рэгіёне немагчыма. У якасці станоўчага прыкладу прывядзём супрацоўніцтва музея Якуба Коласа і Стаўбцоўскага райвыканкама: у 1990–1992 гг. па ініцыятыве загадчыка аддзела культуры Стаўбцоўскага райвыканкама А. Грэкава і дырэктара музея Якуба Коласа З. Камароўскай створаны мастацка-мемарыяльны комплекс «Шлях Коласа». Драўляныя скульптуры, створаныя групай самадзейных майстроў-разьбяроў па дрэве па матывах твораў паэта, тэматычна злучылі музейныя аб’екты і мясціны, звязаныя з імем Якуба Коласа і сталі яшчэ адным цікавым аб’ектам паказу [2].

Такім чынам, на сучасным этапе дзейнасць рэгіянальных філіялаў літаратурных музеяў развіваецца ў двух асноўных кірунках. Музеі імкнуцца заняць пазіцыі культурнай дамінанты ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сваёй мясцовасці, а таксама вядуць актыўную дзейнасць па пазіцыянаванні сябе ў якасці турыстычных аб'ектаў.


1. *Дакументы* па арганізацыі лекцый, выстаў, музейна-педагагічных заняткаў (2003–2010 гг.) // Матэрыялы Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

2. *Дзяржаўны* літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://yakubkolas. by. – Дата доступу : 29.06.2012.

3. *Дзяржаўны* музей гісторыі беларускай літаратуры [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://bellitmuseum.by. – Дата доступу : 21.06.2012.

4. *Мастеница, Е. Н.* Региональный компонент деятельности современного музея / Е.Н. Мастеница // Музеология. Культурология [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www. bvahan. com/museologypro/muzeevedenie.asp?li2=8&c_text=68. – Дата доступа: 10.07.2012.

5. *Страна* замков [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://zamak.by. – Дата доступа: 10.07.2012.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ